# [Выпушчаны сумесны выпуск Беларусі і Расіі. 75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне]

Сёння, 8 мая 2020 года, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпусціла ў абарачэнне паштовы блок «Сумесны выпуск Беларусі і Расіі. 75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне». Пры вырабе блока выкарыстана тэхналогія тэрмічнага ціснення металізаванай фальгой чырвонага колеру. Тыраж блока склаў 20 тысяч.

Праект падрыхтаваны па матэрыялах Усіхсвяцкага прыходу г. Мінска, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Дызайн паштовага блока, спецштэмпеля і канверта «Першы дзень» Яўгеніі Бядонік.

Сумесны выпуск Беларусі і Расіі падрыхтаваны ў азнаменаванне 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны - найвялікшая падзея XX стагоддзя, якое перадвызначыла сучаснае развіццё сусветнай супольнасці.

Падрабязнасці на сайце РУП «Белпошта»

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/08-05-2020-6307*